УДК 37(476)
ББК 74(4Беи)
О232

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ

Редколлегия:
доктор политических наук *В.В. Бущик* (отв. ред.);
кандидат социологических наук, доцент *Д.И. Наумов;*
кандидат педагогических наук, доцент *А.А. Корзюк;*
кандидат филологических наук, доцент *Д.В. Дятко*

Рецензенты:
доктор технических наук, профессор *И.М. Елисеева;*
доктор исторических наук, профессор *Г.А. Космач;*
кандидат социологических наук, доцент *Н.С. Загорская;*
кандидат философских наук, доцент *И.Ю. Никитина;*
кандидат педагогических наук, доцент *Е.Н. Сороко*

О32 **Образование** и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке : сб. науч. ст. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : В.В. Бущик (отв. ред.), Д.И. Наумов, А.А. Корзюк и др. – Минск : БГПУ, 2013. – 344 с.

ISBN 978-985-541-151-3.

В сборнике опубликованы доклады, подготовленные к VI научно-практической конференции молодых ученых БГПУ, состоявшейся 17 мая 2013 г. Анализируются проблемы и перспективы развития современной науки и образования. Рассматриваются вопросы филологии, педагогики, обществознания, психологии, наук о Земле.

Адресуется студентам, аспирантам, преподавателям и всем, кто интересуется тенденциями развития современной науки.

**УДК 37(476)**
**ББК 74(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-151-3**

© БГПУ, 2013

Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# ОБРАЗОВАНИЕ И НАУКА В БЕЛАРУСИ: АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ В XXI ВЕКЕ

*Сборник научных статей*

Минск 2013

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

20. Documents on American Foreign Relations, January 1 – December 31, 1947. Council on foreign relations. – N.Y.: Pub. by Simon and Schuster, 1949. – 742 p.
21. Documents on American foreign relations, January 1 – December 31, 1948. Council on foreign relations – N.Y.: Pub. by Simon and Schuster, 1950. – 705 p.
22. Documents on Germany under Occupation. 1945–1954. – L.– N.Y. – Toronto: Oxford Univ. Press, 1954. – 660 p.
23. Documents on Germany, 1944–1985. – Washington: United States Government Print. Office, 1985. – 1421 p.
24. Documents on Germany. 1944–1959. Background documents on Germany, 1944–1959, and chronology of political developments affecting Berlin, 1945–1956. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1959. – 491 p.
25. Documents on Germany. 1944–1961. Committee on Foreign Relations United States Senate. December 1961. – Washington: United States Govt. Print. Off. , 1961. – 833 p.
26. Documents relating to the termination of the occupation regime in the FRG. – London: H. M. Stat. Off., 1955. – 171 p.
27. Foreign Minister's Meeting. Berlin Discussions. January 25 — February 18. 1954. – Washington: Department of State Publication., 1954. – 274 p.
28. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. 1943. – Washington: United States Govt. Print. Off, 1964. – 2450 p.
29. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. 1944. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1966. – Vol. 1. – 1043 p.
30. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. 1947. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1968. – Vol. 12. – 2026 p.
31. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. 1948. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1973. – Vol. 2. – 2054 p.
32. Foreign Relations of the United States. Diplomatic Papers. 1950. – Washington: United States Govt. Print. Off, 1977. – Vol. 3 – 4. – 2660 p.
33. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. 1951. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1980. – Vol. 3. – 2053 p.
34. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. 1952 – 1954. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1986. – Vol. 7. – 2044 p.
35. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. The conference at Cairo and Tehran, 1943. – Washington: United States Govt. Print. Off, 1961. – 1006 p.
36. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. The conference at Malta and Yalta, 1945.– Washington: United States Govt. Print. Off, 1976. – 1032 p.
37. Foreign relations of the United States. Diplomatic Papers. The conference of Berlin (The Potsdam conference), 1945. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1960. – 1025 p.
38. Germany 1947–1949. The Story in Documents. The Department of State. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1950. – 631 p.
39. Major Problems of the United States Foreign Policy. Vol. 7. (1947–1954). – Washington: United States Govt. Print. Off., 1947–1954.



40. Occupation of Germany. Policy and progress, 1945–1947. The Department of State. – Washington: GPO, 1947. – 241 p.
41. Office of the United States High Commissioner for Germany: Report covering development in Germany during the first quarter of 1950. January 1 to March 31, 1950. – Washington: United States Govnt. Print. Off., 1950. – 70 p.
42. Paris Conference. – Washington: United States Govnt. Print. Off., 1954. – 280 p.
43. United States Department of State. Our foreign policy, 1952. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1952. – 78 p.
44. United States Department of State. The Berlin Crisis. A Report on the Moscow Discussions. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1948. – 61 p.
45. United States Department Policy Planning Staff. 3. Vol. – N.Y.: United States Govt. Print. Off., 1983. – Vol. 1 – 700 p.
46. United States Department Policy Planning Staff. 3. Vol. – N.Y.: United States Govt. Print. Off., 1983. – Vol. 2. – 850 p.
47. United States Department Policy Planning Staff. 3. Vol. – N.Y.: United States Govt. Print. Off., 1983. – Vol. 3. – 935 p.
48. United States Office of military government. Public opinion in occupied Germany. The Office of Military Government of United States, 1945–1949. – Urbana, Chicago, L.: University of Illinois Press, 1970. – 328 p.
49. United States. Congress. Senate. Committee on foreign relations. A Decade of American Foreign Policy: Basic Documents 1941–1949. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1950. – 1381 p.

## ЭТНАКАНФЕСІЯНАЛЬНЫ АСПЕКТ У ПРАГРАМАХ І ДЗЕЙНАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПАРТЫЙ І ГРУП У БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX - ПАЧАТКУ XX ст.

***П.А. Трубчык*, БДПУ (Мінск)**

У канцы XIX – пачатку XX ст. пад уплывам дэмаграфічных працэсаў, сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі этнаканфесійнае становішча паступова змянялася, значна ўзрастала эканамічная, культурная і палітычная актыўнасць многіх этнасаў Паўночна-Заходняга краю. У беларускіх губернях, як і ў цэлым у Расійскай імперыі, афармляюцца палітычныя арганізацыі нацыянальных партый. Гэта было абумоўлена непрыманнем шырокімі пластамі насельніцтва абмежаванняў у сферы нацыянальна-культурных, сацыяльна-эканамічных і канфесійных адносін.

Час афармлення першых нацыянальных партый і груп прыпадае на канец XIX ст. У большасці, гэта былі арганізацыі сацыялістычнай арыентацыі. 25–27 верасня 1897 г. у Вільні адбыўся з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дэмакратычных арганізацый Вільні, Мінска, Віцебска, Беластока, на якім быў утвораны Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд) і абраны ЦК партыі. Лідарам стаў А. Крэмер. Неабходнасць утварэння Бунда тлумачылася тым, што толькі нацыянальная арганізацыя яўрэйскіх рабочых можа найлепш абараніць іх інтарэсы.

У 1901 г. на IV з'ездзе Бунда патрабаванне нацыянальнай аўтаноміі для яўрэяў было прызнана ў якасці канчатковай мэты барацьбы за нацыянальнае раўнапраўе. Будучы дзяржаўны лад Расійскай імперыі з'езд вызначаў як «федэрацыю нацыянальнасцей з поўнай нацыянальнай аўтаноміяй кожнай з іх, незалежна ад займаемай тэрыторыі». Аднак, адзначыўшы небяспеку «распальвання нацыянальнага пачуцця сярод яўрэйскага насельніцтва на шкоду класавай свядомасці пралетарыяту», дэлегаты з'езду адмовіліся выставіць лозунг барацьбы за «поўную нацыянальную аўтаномію» для яўрэяў і прынялі рашэнне змагацца за адмену абмежавальных законаў [12, с. 50]. Нягледзячы на гэта, у агітацыйных кампаніях 1904–1905 гадоў лідары Бунда галоўную ўвагу працягвалі надаваць менавіта нацыянальнаму пытанню, у сувязі з чым на VI з'ездзе Бунда (кастрычнік 1905 г.) некаторыя дэлегаты выказвалі меркаванне, што ЦК пераацэньвае лад яўрэйскага жыцця і дапускае недаацэнку агульнарасійскіх падзей.

У красавіку 1896 г. была ўтворана Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (ЛСДП). Заснавальнікі партыі А. Дамашэвіч і А. Мараўскі імкнуліся распаўсюдзіць яе ўплыў выключна на рабочых, якія размаўлялі на літоўскай мове і выступалі за палітычнае самавызначэнне Літвы. Аднак такая пазіцыя кіраўніцтва ЛСДП не знайшла падтрымкі ў некаторых членаў партыі, што прывяло да яе расколу і ўтварэння ў маі 1896 г. Рабочага саюза Літвы (РСЛ) на чале з С. Трусевічам. Праграма РСЛ, насуперак кіраўніцтву ЛСДП, якое адмаўлялася ад узаемадзеяння з расійскім пралетарыятам, абвяшчала, што «барацьба з царскім дэспатызмам можа быць паспяховай толькі пры ўмове цеснага аб'яднання ўсіх сацыяльна-дэмакратычных груп у Расіі» ў адну партыю. У 1900 г. РСЛ аб'яднаўся з Сацыял-дэмакратыяй Каралеўства Польскага ў выніку чаго ўтварылася Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ) [2].

У пачатку XX ст. у асяроддзі народніцкіх гурткоў і беларускіх студэнцкіх зямляцтваў зараджаюцца ідэі беларускага нацыянальнага руху. На аснове гурткоў беларускай моладзі, якія дзейнічалі ў Вільні, Мінску і Пецярбургу, зімой 1902–1903 гг. была створана Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). У снежні 1903 г. І з'езд Грамады абвясціў яе партыяй беларускага працоўнага народа сацыялістычнай арыентацыі. Галоўнай формай для забеспячэння нацыянальнай свабоды павінна стаць Расійская федэратыўная дэмакратычная рэспубліка. На з'ездзе было вырашана дабівацца для Беларусі аўтаноміі з соймам у Вільні і гарантаванай культурна-нацыянальнай аўтаноміі для нацыянальных меншасцей [5, с. 4].



У студзені 1906 г. у Мінску адбыўся II з'езд БСГ. Паколькі ў склад партыі ўваходзілі прадстаўнікі розных плыняў: ад народнікаў да сацыялістаў, любы паварот палітычных падзей выклікаў абвастрэнне ўнутрыпартыйнай барацьбы. Супрацьстаянне па пытаннях тактычнай дзейнасці партыі працягвалася і на з'ездзе. Тым не менш пад націскам рэвалюцыйна настроеных дэлегатаў прадстаўнікі ліберальна-дэмакратычнай плыні пайшлі на ўступкі. У выніку была прынята новая праграма. У праграме падкрэслівалася, што яна арганізуе «працавітую беднату Беларускага краю без адрознення нацыянальнасцей» з канчатковай мэтай замены капіталістычнага ладу сацыялістычным. Сваёй бліжэйшай задачай БСГ абвясціла звяржэнне самадзяржаўя сумесна з пралетарыятам усёй Расіі і выказалася за ўтварэнне Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі з свабодным самавызначэннем і культурна-нацыянальнай аўтаноміяй народнасцей [11, с. 159].

Найбольш радыкальнай партыяй польскага нацыянальнага руху ў Паўночна-Заходнім краі на пачатку XX ст. была Польская партыя сацыялістычная (ППС). Яшчэ ў 1893 г. на І з'ездзе, які адбыўся ў Вільні, была зацверджана партыйная праграма, зыходным пунктам, якой стаў лозунг аб незалежнай дэмакратычнай рэспубліцы. Аднак значная частка членаў партыі заявіла аб сваёй нязгодзе з гэтым палажэннем, і выказала намер узаемадзейнічаць сумесна з агульнарасійскім рэвалюцыйным рухам, утварыўшы, такім чынам, Сацыял-дэмакратыю Каралеўства Польскага (з 1900 г. – Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ) [4, с. 116]. На чале ППС сталі Ю. Пілсудскі і Я. Стражэцкі. Згодна з партыйнай праграмай, беларускія і літоўскія землі разглядаліся кіраўніцтвам партыі як тэрыторыя ўласнага дамінавання. ППС імкнулася стаць кіруючай сілай сацыялістычнага руху ў Паўночна-Заходнім краі. У сваёй дзейнасці партыя выкарыстоўвала розныя шляхі і метады для пашырэння ўплыву на беларускіх землях. У 1902–1903 гг. ППС займалася выданнем брашур на беларускай мове, а пазней пачала аказваць дапамогу БСГ у выданні прапагандысцкай літаратуры.

У той жа час не заўсёды такое супрацоўніцтва ажыццяўлялася на прынцыпах партнёрства, з улікам нацыянальных інтарэсаў усіх бакоў. Так, радыкальная частка кіраўніцтва ППС (Ю. Пілсудскі, Ф. Перль і інш.) дапускалі ўзаемадзеянне з БСГ толькі ў тых межах, якія ў будучым не маглі стаць перашкодай на шляху да рэалізацыі анексіі ў адносінах да беларускіх земляў. Афіцыйныя дакументы ППС выключалі права беларускага народа на самавызначэнне і стварэнне ўласнай дзяржаўнасці. Праграмныя палажэнні партыі толькі прапаноўвалі ўраўняць у правах беларусаў з іншымі народамі ў межах будучай Польскай дзяржавы. У такой сітуацыі, кіраўніцтва БСГ падкрэслівала, што галоўнай задачай партыі застаецца барацьба за беларускую дзяржаўнасць [3, с. 247].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Відавочна, што наладжванне сумеснай выдавецкай дзейнасці, з боку ППС, было звязана з жаданнем кантраляваць развіццё беларускага руху. Беларускія землі ўспрымаліся як тэрыторыя польскага нацыянальна-культурнага ўплыву. Аддаваць ініцыятыву ў агітацыйнай працы сярод беларускага насельніцтва польскія сацыялісты не жадалі. Больш таго, паколькі праграмныя палажэнні БСГ у гэты перыяд зводзіліся да аўтаноміі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, кіраўніцтва ППС баялася, што беларусы ў будучым могуць пайсці на федэратыўна саюз з рэспубліканскай Расіяй.

Такім чынам, прадстаўнікі ППС не прымалі ідэі беларускага нацыянальна-культурнага развіцця. Беларускія губерні ўспрымаліся імі, як тэрыторыя польска-расійскага супрацьстаяння, дзе на першы план выступалі ўласна польскія інтарэсы.

У лістападзе 1906 г. на IX з'ездзе ППС адбыўся раскол. З аднаго боку, утварылася ППС-рэвалюцыйная фракцыя, якая на чале з Ю. Пілсудскім паранейшаму выстаўляла лозунг незалежнасці Польшчы, з другога боку – ППС-Левіца, якая галоўнай задачай ставіла зверженне царызма ў Расіі і дасягненне аўтаноміі Каралеўства Польскага. У дальнейшым на тэрыторыі беларускіх губерняў ППС страціла свае пазіцыі, а частка прыхільнікаў партыі ўвайшла ў склад Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі (ЛСДП). У сваю чаргу, ППС-Левіца ў партыйнай праграме канстатавала, што «намаганні для аднаўлення ўласнай дзяржаўнасці, якія прадпрымаліся кіраўніцтвам маёмасных класаў, не мелі поспеху. Таму гэту барацьбу павінен давесці да канца толькі пралетарыят, як найбольш дэмакратычны элемент, які больш за іншых церпіць ад нацыянальнага прыгнёту». Такім чынам, зыходзячы з праграмных палажэнняў, партыя выступала за перабудову грамадства на сацыялістычны лад, і патрабавала «шырокай аўтаноміі Польшчы з заканадаўчым сеймам», а таксама «гарантыі правоў нацыянальнасцей, якія знаходзіліся ў колькаснай меншасці і не ўтваралі аўтаномныя адзінкі» [7, с. 114–115].

У 1902 г. на аснове гурткоў, якія аб'ядноўваліся вакол часопісаў «Варпас» («Колакал») і «Укининкас» («Сельскі гаспадар») з'явілася Літоўская дэмакратычная партыя (ЛДП). Праект праграмы ЛДП, які быў апублікаваны ў гэтым жа годзе, абвясціў канчатковай мэтай дзейнасці партыі ўтварэнне незалежнай Літвы. Сродкам дасягнення пастаўленай задачы партыя лічыла барацьбу за дэмакратычную канстытуцыю ў Расіі, якая павінна была даць Літве шырокую аўтаномію ў этнаграфічных межах пражывання літоўцаў. Аўтаномія Літвы павінна была стаць першым крокам на шляху да палітычнай незалежнасці [8, с. 317].

У 1905 г. ЛДП была пераўтворана ў Дэмакратычную партыю Літвы (ДПЛ), якая прыняла новую праграму. З самага пачатку свайго існавання яна паставіла пытанне аб літоўскай дзяржаўнасці і заявіла, што абараняе інтарэсы



ўсяго літоўскага народа, а не якога-небудзь асобнага класа. У праграме дэкларавалася неабходнасць стварэння на тэрыторыі Літвы незалежнай дэмакратычнай рэспублікі, якая была б злучана «федэратыўнымі сувязямі з суседнімі дэмакратычнымі дзяржавамі». У якасці першага кроку для рэалізацыі заяўленай мэты ДПЛ паставіла канкрэтную задачу – дасягненне аўтаноміі «этнаграфічнай Літвы з сеймам у Вільні». Аўтаномію павінен быў прадставіць «сейм» усёй Расіі. Праграма не закранала палітычнага і дзяржаўнага ладу Расіі ў цэлым, аднак дакладна вызначала кампетэнцыю цэнтральнай агульнарасійскай і мясцовай літоўскай выканаўчай улады. Дзяржаўнай мовай у аўтаномным краі павінна была стаць літоўская мова.

У 1906 г. левае крыло ДПЛ стварыла сялянскі саюз у Паўночна-Заходнім краі (Саюз сялян Літвы), які стаў аўтаномным аддзелам ДПЛ. Аднак у 1907 г. ва ўмовах падаўлення рэвалюцыі, Саюз сялян Літвы быў падвергнуты рэпрэсіям з боку царскага ўрада, многія яго члены былі арыштаваны. Пасля паражэння рэвалюцыі 1905–1907 гг. ДПЛ стала больш кансерватыўнай партыяй.

У снежні 1905 г. у выніку зліцця неанародніцкіх яўрэйскіх гурткоў была ўтворана Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя (СЯРП). У Беларусі найбольш уплывовыя арганізацыі СЯРП дзейнічалі ў Віцебскай, Віленскай і Магілёўскай губернях, а таксама ў Мінску. Праграмныя палажэнні ўключалі патрабаванні роўнасці ўсіх грамадзян перад законам без адрознення полу, нацыянальнасці і веравызнання, свабоду сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў і стачак, устанаўлення сапраўднага народаўладдзя, канчатковым праяўленнем якога з'яўляецца дэмакратычная рэспубліка. Аднак члены партыі лічылі, што яўрэйскі пралетарыят мае свае «спецыяльныя задачы», абумоўленыя яго «асобым становішчам сярод іншых народаў свету» ў выніку існавання «вечнай і ўсеагульнай з'явы» – антысемітызму. Яшчэ на першым устаноўчым з'ездзе СЯРП было заяўлена, што «нацыянальнае вызваленне ёсць этап, які яўрэйскі пралетарыят павінен прайсці на шляху да сацыялізму». У сувязі з гэтым, адзіным спосабам вырашэння нацынальнага пытання, на іх думку, з'яўляецца прадастаўленне кожнай нацыянальнасці права «на аўтаномнае кіраванне ўсёй сукупнасцю інтарэсаў яе ўнутранага жыцця». У партыйнай праграме быў вылучаны асобны раздзел: «У вобласці нацыянальнага самакіравання», дзе адзначалася «неабходнасць прызнання раўнапраўя моў усіх без выключэння нацыянальнасцей у школе, судзе, адміністрацыі і г. д.». Далей, размова ішла непасрэдна аб аўтаномным кіраванні: «Справы і патрэбы, якія датычацца якой-небудзь нацыянальнасці, трапляюць пад юрысдыкцыю аўтаномных устаноў, якія функцыянуюць на наступных агульных умовах: кожны народ, які пражывае ў межах Расіі, незалежна ад займаемай ім тэрыторыі, пераўтвараецца ў аўтаномную групу, якая самастойна задавальняе і рэгулюе ўсе свае нацыянальныя патрэбы на аснове дэмакратычнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

будаўніцтва». Лідары партыі Х.І. Жытлоўскі і М. Ратнер падкрэслівалі, што «ні аднаму прыгнечанаму народу нацыянальная аўтаномія не дае так шмат, як яна дае народу яўрэйскаму» [9, с. 42–48].

Некаторыя арганізацыі нацыянальных партый пры вырашэнні нацыянальнага пытання прытрымліваліся ліберальнай ідэалогіі.

7 лютага 1906 г. на Устаноўчым сходзе ў Вільні было абвешчана аб стварэнні Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (ККПЛіБ). Яе арганізатарам і кіраўніком з'яўляўся віленскі епіскап барон Э.Ю. Роп. У сваіх друкаваных органах партыя тлумачыла пазіцыі па нацыянальным пытанні, сутнасць якіх зводзілася да адзінства на аснове каталіцкай веры. У праграме ККПЛіБ сцвярджаецца, што «амаль усе палякі і літоўцы і большая частка беларусаў, насяляючых наш край – каталікі. Вера, зыходзячы з гэтага, адна і ў гэтым наша галоўная сувязь ...» [6, л. 54].

Канчатковы варыянт праграмы ККПЛіБ прадугледжваў усталяванне ў Расійскай дзяржаве канстытуцыйнай манархіі з адказнасцю выканаўчай улады перад парламентам. Для Беларусі і Літвы ўтрымлівалася патрабаванне абласнога самакіравання. Паўнамоцтвы мясцовага самакіравання распаўсюджваліся на ўсе сферы дзяржаўнага жыцця за выключэннем войска, фінансаў, шляхоў дзяржаўнага значэння, пошты і тэлеграфа. У той жа час, для Польшчы праграма прадугледжвала аўтаномію з заканадаўчым сеймам [1, с. 87].

У перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. на беларускіх землях узрастаюць уплывы Польскай дэмакратычна-нацыянальнай партыі (ПДНП). У сакавіку 1906 г. была надрукавана праграма партыі. Яна ўтрымлівала патрабаванне дэцэнтралізацыі Расійскай імперыі, якая павінна абапірацца «на мясцовае самакіраванне, з правам мясцовых арганізацый на ўтварэнне саюзаў, якія б адпавядалі адзінству эканамічных і культурных інтарэсаў тэрыторыі шасці літоўскіх губерняў» [10, с. 184]. Для Польшчы прадугледжвалася аўтаномія з заканадаўчым сеймам. Патрабаванне аўтаноміі для Беларусі і Літвы ў праграме не ўтрымлівалася. Увогуле ў гэты перыяд ў дзейнасці ПДНП назіраецца паглыбленне кансерватыўна-шавіністычных пазіцый, што было звязана з абвастрэннем польска-літоўскіх адносін і з'яўленнем беларускага пытання.

Такім чынам, у канцы XIX – пачатку XX ст. большасць нацыянальных палітычных партый, якія распаўсюджвалі сваю дзейнасць на беларускіх землях, выступалі з ініцыятывай стварэння культурна-нацыянальных аўтаномій для сваіх народаў. У той жа час, некаторыя з іх, выстаўляючы нацыянальныя патрабаванні, суб'ектыўна ацэньвалі становішча народаў Паўночна-Заходняга краю ў сферы нацыянальна-канфесійных адносін, даволі насцярожана ўспрымалі беларускі рух і шукалі магчымасці яго нейтралізацыі. На гэтым этапе толькі БСГ адлюстроўвала пазіцыі, дзе былі адзначаны ўмовы нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа.



**Літаратура**


1. *Біч, М.В.* Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі / М.В. Біч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1997. – Т. 4. – 432 с.
2. *Видмантас, Э.Ю.* Социал-демократическая печать и рабочее движение в Литве в 1895–1907 гг. / Э.Ю. Видмантас. – Вильнюс, 1977.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 584 с.
4. Общественное движение на польских землях. – М., 1988.
5. Программа Белорусской социалистической Громады // Праграмныя дакументы палітычных партый. – Мінск: БДУ, 1994. – 100 с.
6. Программа Конституционно-католической партии для Литвы и Белоруссии // РДГА. – Фонд 821. Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў Міністэрства ўнутраных спраў. – Воп. 3. – Спр. 1020.
7. Программа Польской социалистической партии (1908 г.) // Программные документы национальных политических партий и организаций России (конец XIX в.– 1917 г.): сб. док. / сост. В.М. Фомин. – М.: ИНИОН РАН. – 1996. – 202 с.
8. Программы политических партий России: конец XIX – начало XX вв. – М.: РОССПЭН, 1995. – 464 с.
9. Программы политических партий / под ред. и с предисл. С.С. Зака. – 2-е изд., испр. – Одесса, 1917.
10. *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Смалянчук. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
11. *Шлюбскі, А.* Да гісторыі БСГ / А. Шлюбскі // Полымя. – 1925. – № 5. – С. 157–63.
12. *Яцкевич, И.* Бунд и национальный вопрос в 1908–1910 гг. / И. Яцкевич // Евреи Беларуси: история и культура: сб. ст. Вып. 2. – Минск: ПКП «АРТИ-ФЕКС», 1998. – 227 с.


# ПЕРИОДИЗАЦИЯ СОВЕТСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ АГРАРНОЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ КОНЦА XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XIX в.

***Н.К. Тукайло*, БГПУ (Минск)**

До начала XX в. социально-экономическая история Беларуси практически не изучалась. Исследований аграрной истории Беларуси переходного периода конца XVIII – первой половины XIX в. практически нет. С началом XX в. историки обращаются к проблеме кризиса феодально-крепостнической системы и зарождения капиталистических отношений. Аграрная история Беларуси исследуемого периода не получила специального освещения в ли-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ